МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# НАУКА. ОБРАЗОВАНИЕ. ТЕХНОЛОГИИ-2010

## МАТЕРИАЛЫ III МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

**21—22 октября 2010 г.**
**г. Барановичи**
**Республика Беларусь**

Репозиторий БарГУ

**Барановичи**
**РИО БарГУ**
**2010**

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

УДК 37(063)
ББК 74.58
Н34

Рекомендовано к печати научно-методическим советом учреждения образования «Барановичский государственный университет»

Р е ц е н з е н т ы:

*Н. Я. Игнатенко,* доктор педагогических наук, профессор
(Крымский гуманитарный университет, Украина);
*В. К. Шелег,* доктор технических наук, профессор
(Белорусский национальный технический университет, Республика Беларусь)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я:

*А. В. Никишова* (гл. ред.), *И. А. Богданович* (отв. ред.), *В. Н. Зуев* (отв. ред.), *А. В. Литвинский, Е. И. Пономарева, В. В. Хитрюк, В. И. Козел, О. И. Наранович, Ю. К. Калугин, Д. А. Ционенко, Е. Г. Карапетова*

**Н34** **Наука. Образование. Технологии-2010** [Текст] : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., 21—22 окт. 2010 г., Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2010. — 275, [3] с. : ил. — экз. — ISBN 978-985-498-370-7.

В сборнике приведены материалы, представленные на III Международную научно-практическую конференцию «Наука. Образование. Технологии-2010». Освящены результаты научно-исследовательской работы по педагогике, психологии, истории, языкознанию и методике преподавания различных дисциплин. Рассмотрены проблемы, касающиеся системы менеджмента в высшей школе, иформационных технологий в науке, образовании и производстве. Широко освящаются актуальные научные проблемы фундаментальных наук, а также современные методы, технологии получения и обработки материалов в машиностроении и других отраслях.

Издание предназначено для широкого круга научных работников, преподавателей, аспирантов и студентов.

Табл. 20. Рис. 72.

**УДК 37(063)**
**ББК 74.58**

**ISBN 978-985-498-370-7**

© Коллектив авторов, 2010
© БарГУ, 2010

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

справилось с основными социальными задачами послевоенной поры, создало необходимые условия для нового подъема здравоохранения, образования, культуры, материального благосостояния.

### Список источников*

1. *Ванчинов, Д. П.* Саратовское Поволжье в годы Великой Отечественной войны 1941—45 / Д. П. Ванчиков. — Саратов : Изд-во СГУ, 1976. — С.132—133.
2. ГАСО, Ф. Р-2052., Оп. 39, Д. 3422., Л. 2—3.
3. ГАСО, ф. Р-2052, Оп. 39, Д. 3645, Л.2.
4. Книга памяти. Они ковали победу в тылу 1941-1945. — Саратов : Приволжское кн. изд-во, 2009.
5. *Фролов, Д. Ф.* Единство тыла и фронта / Д. Ф. Фролова. — Саратов : Приволжское кн. изд-во,1988.

**Резюме.** В статье рассматриваются социальные последствия Великой Отечественной войны разного уровня и характера для одного из регионов России — Саратовской области.
**Resume.** Social results of Great Patriotic War of different level and character for one of the regions of Russia – Saratov Region – are considered in the article.

***А. У. Літвінскі***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ПЫТАННІ ЎЗ’ЯДНАННЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў СУЧАСНАЙ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ВНУ

**Ключавыя словы:** Заходняя Беларусь, уз’яднанне, гісторыкі, інтэрпрэтацыя, падручнікі.
**Key words:** Western Belarus, reunion, historians, interpretation, textbooks.

Падзеі восені 1939 г. з’явіліся вызначальнымі для лёсу беларускага народа. Скончыўся перыяд раз’яднання Беларусі. Яе заходнія землі пазбавіліся пагрозы паланізацыі, адбыўся гаспадарчы і сацыяльна-культурны ўздым гэтых тэрыторый.

Дадзеныя тэзісы паслядоўна адстойваліся ў савецкай гістарычнай навуцы. Яшчэ, у адпаведнасці з духам часу, беларускія савецкія гісторыкі дадавалі, што пасля падзей восені 1939 г. народ Заходняй Беларусі далучыўся да пабудовы сацыялізму, і гэта лічылася найважнейшым вынікам уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у складзе СССР. Зразумела, нельга было пакінуць па-за ўвагай тое, што гэтае ўз’яднанне адбылося тады, калі пачалася другая сусветная вайна, першай дзяржавай-ахвярай у якой стала Польшча. Аднак, паколькі факт існавання сакрэтнага дадатку да савецка-германскага дагавора аб узаемным ненападзе ад 23 жніўня 1939 г. наогул адмаўляўся, то і пазіцыя СССР па заходнебеларускім пытанні ў савецкай навукова-гістарычнай і вучэбнай літаратуры выглядала бездакорнай.

З другой паловы 80-х гг. ХХ ст. як прадстаўнікі грамадскасці, так і прафесійныя гісторыкі пачалі задаваць і абмяркоўваць пытанні, на якія не было адказу ў традыцыйнай савецкай гістарыяграфіі праблемы. Якую ацэнку даць сакрэтнаму пратаколу — дадатку да так званага «пакта Молатава — Рыбентропа»? Як сумясціць тэзіс аб росквіце Заходняй Беларусі ў складзе СССР з уваходжаннем яе ў зону дзеяння таталітарнага рэжыму? Ці варта ўвогуле маляваць працэс уз’яднання выключна светлымі фарбамі? Адказ на гэтыя пытанні ў шмат чым залежаў ад каштоўнаснай арыентацыі гісторыкаў.

Зразумела, погляды навукоўцаў знайшлі сваё ўвасабленне і на старонках вучэбнай літаратура для вышэйшай школы. Асэнсаванне гэтых поглядаў мае безумоўную актуальнасць, паколькі аўтары падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, курсаў лекцый выкарыстоўваюць магчымасць істотна ўплываць на працэс фарміравання гістарычнай свядомасці грамадзян Беларусі. Між тым, на нашу думку, спецыялісты ў галіне гістарыяграфіі ўдзяляюць недастатковую ўвагу адукацыйнаму зместу навукова-гістарычных выданняў, таму вывучэнне гэтага зместу ў пэўным сэнсе сведчыць пра наватарскі падыход да разгляду гістарыяграфічнай тэматыкі. У межах артыкула фактычна немагчыма зрабіць грунтоўны і ўсебаковы аналіз зместу вучэбнай літаратуры, аднак асноўныя тэндэнцыі ў асвятленні праблемы ўз’яднання акрэсліць можна.

Мэтай даследавання з’яўляецца высвятленне як падабенства, так і адрозненняў у пазіцыях беларускіх гісторыкаў па праблеме ўз’яднання беларускага народа, якое адбылося ў 1939 г. (маюцца на ўвазе пазіцыі, адлюстраваныя ў вучэбнай літаратуры для ВНУ). Дадзеная мэта вызначае канкрэтныя задачы даследавання: аналіз уплыву савецкай гістарыяграфічнай традыцыі на погляды сучасных навукоўцаў, а таксама разгляд у абраным кантэксце такога аспекта, як ацэнка ў падручніках і дапаможніках падзей, з якіх склаўся працэс уз’яднання. У працэсе вырашэння гэтых задач аўтар кіраваўся метадалагічнымі прынцыпамі аб’ектыўнасці і гістарызму, выкарыстоўваў метады параўнальна-гістарычнага і структурна-функцыянальнага аналізу.

* Список источников приводится в авторской редакции.



Рэпазіторый БарГУ
PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

Інтэрпрэтацыя аўтарамі вучэбнай літаратуры фактаў, якія мелі месца ў гісторыі Беларусі з верасня 1939 г. да 22 чэрвеня 1941 г., пры відавочных рысах падабенства ўсё ж у пэўнай ступені адрозніваецца. Навукоўцы аддаюць перавагу традыцыйнаму тэрміну «ўз'яднанне», і гэта, на наш погляд, апраўдана — нельга ж сапраўды адмаўляць факт аб'яднання беларускага народа ў складзе адной дзяржавы. Магчыма, больш карэктным з'яўляецца словазлучэнне «ўз'яднанне беларускага народа», якое ўжывае П. Г. Чыгрынаў і якое перш за ўсё характарызуе этнічны фактар у параўнанні з дзяржаўна-палітычным і тым адрозніваецца ад больш звыклага выразу «ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР» [6, с. 361]. Справа ў тым, што ў перыяд ад абвяшчэння ССРБ да падпісання трагічнай для Беларусі Рыжскай дамовы заходнія землі Беларусі ўваходзілі ў склад БССР толькі эпізадычна. Праўда, праз некалькі старонак аўтар ужывае тэрмін, блізкі да традыцыйнага [6, с. 367].

Фармальна-юрыдычнаму тэрміну «ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР» аддае перавагу І. А. Саракавік, аднак у іншых месцах ён аддае даніну слову «ўз'яднанне», ужываючы яго як у этнічным, так і ў дзяржаўна-палітычным сэнсе [5, с. 311, 313, 315]. Аднак Ю. Л. Грузіцкі, аўтар адпаведнага раздзела ў вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана, прытрымліваецца такой фармулёўкі: «Вызваленне Заходняй Беларусі і яе аб'яднанне з БССР», хаця і ён не абышоўся без тэрміну «ўз'яднанне» [3, с. 419]. Цікава, што далей у тэксце ўзгадваюцца гістарычныя факты, якія не вельмі стасуюцца са словам «вызваленне».

Аўтары вучэбнай літаратуры, аналізуючы сакрэтны пратакол, які з'яўляўся дадаткам да «пакта Молатава — Рыбентропа», у цэлым пагаджаюцца з тым, што гэты дакумент супярэчыў нормам міжнароднага права. Аднак на старонках вучэбных дапаможнікаў, прынамсі тых, якія ніжэй пералічаны ў спісе літаратурных крыніц, не сустракаюцца шкадаванні наконт таго, што ўз'яднанне беларускага народа адбылося менавіта такім, а не іншым шляхам. Звяртаецца ўвага на факт падабенства савецка-польскай Рыжскай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г. і пагаднення паміж Германіяй і СССР ад 23 жніўня 1939 г., паколькі ў першым выпадку ахвярай стала Беларусь (як і Украіна), а ў другім — сама Польшча [2, с. 439].

Не застаўся па-за ўвагай і факт перадачы сталінскім урадам Вільні і Віленшчыны ў склад Літвы ў кастрычніку 1939 г. і ў лістападзе 1940 г. Напрыклад, досыць падрабязна распавядаецца пра гэта ў вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля [1, с. 224—226]. Тут аўтары адзіныя ў сваім негатыўным стаўленні да гэтага акту, які супярэчыў інтарэсам беларускага народа, хаця, з другога боку, яны даволі асцярожныя ў выказваннях.

Без істотных адрозненняў апісваецца ў вучэбнай літаратуры вызваленчы паход Чырвонай Арміі, які пачаўся 17 верасня 1939 г. Звяртаецца ўвага на тое, што нягледзячы на распарадженне польскага ўрада не весці баявых дзеянняў супраць «саветаў», асобныя сутыкненні ўсё ж мелі месца, аднак яны не аказалі прыкметнага ўплыву на сітуацыю. Падкрэсліваецца, што большая частка народа Заходняй Беларусі прыязна, з радасцю сустрэла савецкіх салдатаў [4, с. 113]. Аднак, на наш погляд, можна было б удзяліць больш увагі разгляду пазіцыі незадаволенай меншасці. Праўда, гэтае пытанне пакуль што не ў дастатковай ступені вывучана ў беларускай гістарычнай навуцы.

Пэўныя разыходжанні назіраюцца ў вучэбнай літаратуры па пытанні аб парадку склікання і характары дзейнасці Народнага сходу Заходняй Беларусі, які адбыўся ў Беластоку 28—30 кастрычніка 1939 г. Частка навукоўцаў імкнецца падкрэсліць дэмакратычны характар і нязмушанасць выбараў у Народны сход [1, с. 223; 4, с. 113—114]. Другая частка займае больш крытычную і, на нашу думку, больш рэалістычную пазіцыю. У прыватнасці, сцвярджаецца, што на вынікі выбараў непасрэдны ўплыў аказала выкананне пастановы Палітбюро ЦК УКП(б) ад 1 кастрычніка 1939 г. «Пытанні Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны» [2, с. 444; 3, с. 420—421; 5, с 314—315].

У адрозненне ад савецкай гістарыяграфіі, якая фактычна замоўчвала негатыўныя з'явы, што адбываліся на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі перад Вялікай Айчыннай вайной, і рабіла акцэнт толькі на станоўчых працэсах, сучасныя беларускія гісторыкі імкнуцца да ўзважаных ацэнак. Гэтая тэндэнцыя ў дастатковай ступені адлюстравана на старонках вучэбнай літаратуры. Аўтары ў розных прапорцыях размяркоўваюць пазітыў і негатыў, аднак фактычна ўсе яны згодныя з тым, што ў перадваенны час адбывалася саветызацыя Заходняй Беларусі. Да станоўчых фактараў яны, як правіла, адносяць надзяленне малазямельных і беззямельных сялян зямлёй, ліквідацыю беспрацоўя, рэканструкцыю старых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў, стварэнне сеткі рознаўзроўневых медыцынскіх, адукацыйных і культурна-асветніцкіх устаноў, паступовы пераход на беларускую мову ў сферы адукацыі пры захаванні правоў нацыянальных меншасцей. Да адмоўных — палітычная рэпрэсіі, якія часам мелі прэвентыўны характар, перанасычанасць кіруючымі кадрамі з усходніх абласцей у спалучэнні з недаверам да мясцовых людзей, распачатую прымусовую калектывізацыю, узрастанне кошту тавараў народнага спажывання [1, с. 223—224; 2, с. 443, 446, 448—450; 3, с. 422—424; 4, с. 114—117; 5, с. 317—319; 6, с. 369—370].

Такім чынам, у сучаснай беларускай вучэбнай літаратуры для ВНУ даецца станоўчая ацэнка факту ўз'яднання беларускага народа ў складзе БССР. У гэтых адносінах аўтары вучэбных дапаможнікаў і курсаў лекцый прытрымліваюцца гістарыяграфічнай традыцыі, што склалася яшчэ ў савецкія часы. Аднак відавочнай з'яўляецца тэндэнцыя, якая прадугледжвае імкненне паказаць таксама ўсю складанасць, супярэчлівасць і неадназначнасць гістарычных з'яў і працэсаў, што адбываліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі з восені 1939 г. да лета 1941 г. Можна меркаваць, што дадзеная тэндэнцыя ў далейшым атрымае сваё развіццё.



Рэпазіторый БарДУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com

**Спіс крыніц**

1. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапаможнік : у 2 ч. — Мн. : Універсітэцкае, 2001. — Ч. 2. : Люты 1917 г. — 2000 г. / Я. К. Новік [і інш.] ; пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. — 2-е выд., перапрац. і дап. — 464 с.
2. Гісторыя Беларусі : XIX—XX стагоддзі : курс лекцый : у 2 ч. / П. І. Брыгадзін [і інш.]. — Мн. : РІВШ БДУ, 2002. — 656 с.
3. Гісторыя Беларусі : (у кантэксце сусветнай цывілізацыі) : вучэб. дапаможнік / В. І. Галубовіч [і інш.] ; пад рэд. В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. — Мн. : Экаперспектыва, 2005. — 584 с.
4. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэб. дапаможнік : у 2 ч. / пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — Ч. 2. — 211 с.
5. *Саракавік, І. А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. — Минск : Соврем. шк., 2006. — 456 с.
6. *Чигринов, П. Г.* Очерки истории Беларуси : учеб. пособие / П. Г. Чигринов. — 3-е изд., испр. — Минск : Выш. шк., 2007. — 463 с.

**Рэзюме.** У артыкуле разглядаюцца розныя погляды гісторыкаў на працэс уз'яднання Беларусі ў 1939 г., адлюстраваныя у вучэбнай літаратуры для ВНУ.

**Resume.** The article gives reflections on different points of view of historians on the process of reunion of Belarus in 1939 given in the textbooks for higher educational establishments in Belarus.

Репозиторий БарГУ

PDF created with pdfFactory Pro trial version www.pdffactory.com